

# Ключніцы Нацыянальнай бібліятэкі

***На будоўлі Нацыянальнай бібліятэкіБеларусі працуе унікальны студэнцкіатрад— гонар Беларускага нацыянальнага тэхнічнагауніверсітэта: уяго складзе толькі дзяўчаты.***

— Напачатку нас было адзінаццаць, аднак тры дзяўчыны "адкалоліся" ў першы ж дзёнь, бо спалохаліся пыльнай працы, — расказваюць Оля, Марына і Каця, якіх я заспела каля бытоўкі ў час абедзеннага перапынку. — Затое цяпер нашы шэрагі папаўняюцца амаль кожны дзень, прычым не толькі дзяўчатамі з БНТУ, але і з іншых ВНУ і каледжаў. Усе хочуць папрацаваць на будаўніцтве Нацыянальнай бібліятэкі.

А паколькі цяжка пада-. браць на будоўлі прыдатную жаночую працу, студэнткам прапанавалі пасады ключніц. Як расказалі дзяўчаты, кожную раніцу яны адчыняюць дзверы для рабочых і такім чынам забяспечваюць гатоўнасць паверхаў да працы. У іх абавязак таксама ўваходзіць не пускаць у памяшканні тых людзей, якіх там быць не павінна. Дзяўчаты сочаць за парадкам, наглядаюць, каб будаўнічая маёмасць не была пашкоджана, каб не было сапсавана ўжо зробленае.

— На жаль, вандалы сустракаюцца і сярод саміх рабочых. "Пісьмы" на сценах — гэта, бадай, самая бяскрыўдная выхадка, але і яе трэба прадухіліць, — гаворыць Марына, студэнтка прыборабудаўнічага факультэта.

Зразумела, на будоўлі дзяўчат не нагружаюць цяжкай працай. Самая вялікая цяжкасць — пад'ём па лесвіцы на 17-ты паверх з унушальнымі звязкамі ключэй ад шматлікіх дзвярэй бібліятэкі. Аднак, здзейсніўшы гэтае ўзыходжанне разам з маімі новымі знаёмымі (праўда, толькі на дзесяты паверх), магу запэўніць: праца гэта цалкам жаночая. На вышыні, дарэчы, мы сустрэлі "галоўную ключніцу" — работніцу будаўнічай арганізацыі, якая кіруе студэнткамі.

— На любой будоўлі ёсць ключнікі, — растлумачыла Галіна Міхайлаўна. — У бібліятэцы дзяўчаты абслугоўваюць 10 паверхаў, дзе ўжо ідуць аддзелачныя работы, і тут яны гаспадыні. Іх задача — не дапускаць прастою ў рабоце. А гэта няпроста, бо Нацыянальная бібліятэка — аб'ект вялізны і складаны, здаць яго плануецца ў верасні, таму перапынкі ў рабоце проста недапушчальныя.

На думку Галіны Міхайлаўны, больш адказных работніц, чым яе падапечныя, проста не знайсці. Дзяўчаты працуюць з задавальненнем, вельмі добра арыентуюцца ў лабірынтах бібліятэкі і не дапускаюць у рабоце браку.

Пакуль студэнткі паказвалі мне сваю вотчыну, сакратар камітэта БРСМ БНТУ Юрый Чачукевіч (які і арганізаваў гэтую экскурсію) расказаў пра стасункі універсітэта і бібліятэкі. Так, БНТУ супрацоўнічае з Нацыянальнай бібліятэкай ужо другі год. Летась, калі студэнты сюды прыйшлі, было пабудавана толькі 12 паверхаў, таму ім давялося стаць сведкдмі і ўдзельнікамі ўзвядзення маналітнай часткі будынка. Праз бібліятэку ў мінулым годзе прайшло шмат студатрадаў. Работадаўцы засталіся задаволены студэнтамі БНТУ, таму сёлета будаўнічае ўпраўленне № 7 запрасіла іх зноў. У гэтым годзе атрадаў менш: цяпер, на апошнім этапе будаўніцтва, засталіся ў асноўным работы высокатэхналагічныя, якія выконваюць спецыялісты. Акрамя дзявочага атрада ад БНТУ працуе і мужчынскі атрад. Хлопцы займаюцца ўборкай, ачысткай памяшканняў ад смецця, добраўпарадкаваннем.

Увогуле, для БНТУ будатрады вельмі актуальныя. У мінулым годзе ў іх удзельнічала каля 400 студэнтаў. Ва універсітэце ёсць будаўнічы факультэт, факультэт энергетычнага будаўніцтва, факультэт транспартных камунікацый — менавіта іх прадстаўнікі і працуюць на будоўлях. На будаўнічым факультэце, напрыклад, праца ў профільным студатрадзе залічваецца ў якасці вытворчай практыкі.

Будаўнічыя арганізацыі са свайго боку таксама зацікаўлены ў студэнтах. Улетку многія прафесійныя рабочыя ад'язджаюць у Расію на заробкі, таму рабочай сілы не хапае. Да таго ж студэнты-"тэхнары" не па чутках ведаюць, што такое будоўля, і часам ім давяраюць вельмі адказныя ўчасткі работы., Напрыклад, у гэты час студэнты БНТУ працуюць на будоўлі аграгарадка ў вёсцы Жораўка (Любанскі раён) — там яны самі закладваюць фундамент для домікаў.

Цэняць работадаўцы ў студэнтах і іншую якасць — іх запал.

— Для рабочых іх праца звыклая і сумная. Калі яны працуюць "на аўтамаце", то студэнты — з цікавасцю і азартам. і вынікі ў іх, канечне, лепшыя. Таму нярэдка нашы студэнты зарабляюць значна больш за прафесійных рабочых, — гаворыць Юрый.

...Але вернемся да нашых ключніц. Хоць праца ў іх жаночая, але любая будоўля — гэта месца траўманебяспечнае. Таму перад пачаткам працы ўсе студэнткі ўважліва вывучалі тэхніку бяспекі: напачатку былі лекцыі ва універсітэце, затым — інструктаж на прадпрыемстве і непасрэдна на аб'екце. Дзяўчаты будуць тут працаваць не менш за месяц і атрымаюць мінімум па 200 тысяч рублёў. Акрамя таго, самых лепшых работніц чакае 30-працэнтная прэмія; пярвічка БРСМ традыцыйна заахвочвае студэнтаў, якія працуюць найбольш якасна. Праўда, дзяўчаты кажуць, што іх цікавяць не грошы. Яны на будоўлі таму, што тут цікава, весела, шмат новых людзей і знаёмстваў і працуе тут у асноўным моладзь. А яшчэ таму, каб потым згадваць: яны адчынялі дзверы на будоўлі стагоддзя.



**Іна НІКІЦЕНКА.**

НА ЗДЫМКАХ: від з 10-га паверха бібліятэкі; ключніцы Вольга, Марына і Кацярына (злева направа).

**Фота аўтара.**